# СЯЛЯНСКІ СВЕТ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР У "ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ" ІВАНА МЕЛЕЖА І ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ТЭТРАЛОГІІ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

***Ю. А. Шчука***
Навуковы кіраўнік – д.філал.н., дацэнт ***Г. К. Тычко***
*Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава*

У час, калі Вячаслаў Адамчык прыйшоў у літаратуру, ужо былі напісаны маштабныя творы пра жыццё беларускага сялянства, матэрыялам для якіх стала жыццё насельнікаў поўдня Беларусі – палешукоў. Тут мы маем на ўвазе "На ростанях" Якуба Коласа і "Палескую хроніку" Івана Мележа. Аднак заставаўся нераспрацаваным такі пласт нацыянальнага жыцця, як заходнебеларуская вёска, з якой паходзіў сам Адамчык. Гэтая задача была ім вырашана ў серыі з чатырох раманаў.

Натуральна, што пры стварэнні сваіх кніг празаік не мог не ўлічваць вопыт папярэднікаў. Услед за І.Мележам В.Адамчык. звяртаецца да аднаго з самых складаных перыядаў жыцця беларусаў – часу паміж рэвалюцыяй і Вялікай Айчыннай вайной. Гэты час трактуецца Адамчыкам не толькі як пара ломкі старога свету, але і як усталяванне новых чалавечых адносін. Аднак празаік не столькі акцэнтуе ўвагу на адмоўным у жыцці герояў, колькі імкнецца прасачыць на іх прыкладзе лёс усяго сялянства, якое апынулася на пераломе гісторыі. Апора на нацыянальныя традыцыі асабліва поўна выяўляецца ў тых эпізодах, дзе Адамчык піша пра знаёмыя сялянскія справы: працу на полі, малацьбу, вячоркі і інш. Шляхам стварэння шырокага дыяпазону чалавечых характараў, выражэння глыбокай павагі да чалавека працы В.Адамчык дасягае своеасаблівасці аўтарскай пазіцыі, выразнасці ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі твора. Вельмі цікавымі атрымаліся аўтарскія назіранні за зменамі ў светапоглядзе людзей, якія жывуць у Заходняй Беларусі ў складаны час трыццатых гадоў.

Быццам ідучы за класікамі, Адамчык імкнецца спасцігнуць народны менталітэт беларусаў, убачыць вытокі дабра і чалавечнасці ў кожным персанажы: чытач бачыць Уласа Корсака, старую Мондрыху, Хрысцю і іншых персанажаў у заўсёдным руплівым клопаце. Невыпадкова ў раманы Адамчыка ўведзена лінія асабістых адносін герояў: каханне Алесі і Імполя, Міці і Чэсі, Міці і Яніны. Вясковая дзяўчына ў яго, як і ў Мележа, апісваецца як жывы, рухомы характар. Душэўная прыгажосць сялянскай дзяўчыны найбольш яскрава раскрываецца праз каханне. На вобразе Алесі, якая дзеля дасягнення свайго шчасця ідзе на злачынства, сцвярджаецца няўхільнасць пакарання за эгаізм і жорсткасць. Адамчык не абмяжоўваецца асуджэннем гераіні, а спрабуе зразумець яе душэўны стан. У юнацтве, марачы пра нейкую іншую будучыню, чым вясковая, яна крытычна ставілася да сялянскага побыту, да простых хлопцаў, выйшла замуж за нялюбага Ладака, а пасля яго смерці ўзяла ў прымы маладога Імполя. Жыццё адпомсціла ёй, як і мележаўскай Ганне, за здраду светлым марам: Імполь аддаляецца ад Алесі, сыходзячыся з Хрысцяй. Пачуцці Міці і Чэсі таксама складваюцца няпроста, бо іх каханне вымушанае пераадольваць перашкоды жорсткага свету, падзеленага на "сваіх" і "чужых". Тым не меней, кахаючы Чэсю, ідучы за яе прывабным аблічам, Міця вырас духоўна, узяў нямала ад яе выхаванасці. У час апошняй сустрэчы, нібы развітваючыся і падводзячы вынікі свайго кахання, яны яшчэ раз зазіраюць кожны ў сваю душу, каб пераканацца, што былі патрэбны адзін другому. У Міці было і другое каханне – Яніна, дачка солтыса, якая апынаецца побач з хлопцам у той момант, калі яму пагражае нейкая непрыемнасць. Але іх адносіны таксама маюць трагічны вынік: Міця як сакратар сельсавета вымушаны ўдзельнічаць у высылцы сям'і Вайтовічаў і нават ісці арыштоўваць Яніну, якая ў гэты час адсутнічала дома.

Агульная ідэйная канцэпцыя раманаў вельмі выразная і актуальная: хаця ў трывожны для Радзімы час не стала Міці, вечная рака народнага жыцця зноў няспынна плыве, змяняюцца пакаленні. Адметнасць усіх чатырох кніг Адамчыка ў тым, што прырода, зямля, народны побыт, зліты з гэтай прыродай, становяцца нечым адным цэлым, ствараюць свет народа. Па словах В.У.Міхальчука, "адной з асаблівасцей беларускага рамана з'яўляецца тое, што ў сферы мастацкага ўзнаўлення абставін і характараў ён ішоў да сацыяльных абагульненняў праз бытапісанне"(2,80). Адпаведны ход аўтарскай думкі назіраецца і ў прозе В.Адамчыка.